# ДЫНАМІКА КОЛЬКАСНАГА СКЛАДУ МІРАВЫХ ПАСРЭДНІКАЎ У БЕЛАРУСІ

***С.А. Талмачова,***
***канд. гіст. навук, дацэнт БДПУ***

Для рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. быў створаны інстытут міравых пасрэднікаў. Кола дзейнасці міравых пасрэднікаў было акрэслена «Палажэннем аб губернскіх і павятовых па сялянскіх справах установах» [1]. Пасрэднікі былі надзелены шэрагам паўнамоцтваў як у адміністрацыйных, так і судова-натарыяльных справах. Асноўным іх абавязкам было рэгуляванне пазямельных адносін паміж сялянамі і памешчыкамі: увядзенне, а ў некаторых выпадках і складанне ўстаўных грамат, развярстанне ўгоддзяў, павышэнне ці паніжэнне павіннасцей, увядзенне выкупных актаў, спагнанне нядоімак і г. д., а таксама зацвярджэнне на пасадах асоб сялянскага самакіравання.

Да судовых сп'раў адносіўся разбор спрэчак, непаразуменняў і скаргаў на памешчыка, асобных сялян і органы сялянскага грамадскага самакіравання. Натарыяльныя справы ўключалі засведчанне розных актаў, якія заключаліся паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі. Пасрэднікам было даручана выкананне некаторых судова-паліцэйскіх функцый: аб патравах, парубках лесу і г. д. [1]. З распаўсюджаннем на тэрыторыі Беларусі судовай рэформы 1864 г. судовыя функцыі з 1872 г. перадаваліся міравому суду.

Прэстыжу пасады пасрэдніка ў значнай ступені садзейнічалі яго незмяняемасць, незалежнасць, шырокая ступень самастойнасці, галоснасць дзейнасці. Пасрэднік не мог быць зняты з пасады адміністрацыйным шляхам. Ён не быў прама і непасрэдна падначалены нават міравому з'езду і губернскай адміністрацыі. У сакавіку 1861 г. МУС даў тлумачэнні губернатарам: «Дзеянні пасрэднікаў падлягаюць у пэўных выпадках пераглядну па рашэнню губернскіх прысутнасцяў, але падпарадкавання тут няма» [2, л.4].

Пасрэднікі не атрымоўвалі жалавання, але ім давалася па 1500 руб. на ўтрыманне канцылярыі і іншыя патрэбы, неабходныя для выканання іх паўнамоцтваў. Справаздачы аб выдатках з гэтай сумы не патрабавалася. Зазначым, што ў больш позніх законах, цыркулярах і іншых дакументах



гэтыя грошы называліся тэрмінам «утрыманне», а не «жалаванне» [1]. Але не аклады заахвочвалі пасрэднікаў першага трохгадовага склікання. Яны былі даволі забяспечанымі асобамі, таму што гэтую пасаду мог заняць толькі мясцовы патомны дваранін, які валодаў зямельнай маёмасцю не менш 500 дзес. [1].

Рэалізацыя закону аб міравых пасрэдніках пачалася адразу пасля пачатку рэформы. На першыя тры гады міравыя пасрэднікі выбіраліся з мясцовых дваран-памешчыкаў. У 1861 г., калі толькі пачаўся падзел паветаў на міравыя ўчасткі, на якія распаўсюджвалася ўлада пасрэдніка, ў склад участкаў ўваходзілі ад 2 да 9 валасцей, а кожны павет падзяляўся звычайна на 4-6, у вельмі рэдкіх выпадках - на 2-3 участкі міравых пасрэднікаў.

У сувязі з паўстаннем 1863-1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі адбыўся новы падзел паветаў на міравыя ўчасткі і валасці. Гэта было выклікана палітычнымі матывамі. Па загаду М.М. Мураўёва ад 10 кастрычніка 1864 г. дробныя валасці і грамады аб'ядноўваліся ў больш буйныя, якія складаліся не менш як з 1000 рэвізскіх душ, але з адлегласцю паміж паселішчамі і валасным праўленнем не болей 12 вёрст. Мэта была адна - «каб урад меў апору ў аднадушным дзеянні больш буйных адміністрацыйных адзінак» [3, л. 6].

У 1863 г. пачалося скарачэнне і міравых участкаў і, адпаведна, колькасці міравых пасрэднікаў [4, л. 6]. Міністр унутраных спраў адзначаў у якасці прычын, з аднаго боку, значнае змяншэнне заняткаў міравых пасрэднікаў і, з другога - імкненне да «палягчэння земства ў выдатках па ўтрыманні міравых устаноў». «Змяншэнне заняткаў» вынікала са знішчэння абавязковых адносін паміж сялянамі і памешчыкамі ў заходніх губернях і стварэннем паверачных камісій. У выніку ў кампетэнцыю міравых пасрэднікаў у краі больш не ўваходзіў шэраг былых абавязкаў: 1) разбор спрэчак і скаргаў, што ўзнікалі з-за нявырашанасці пазямельных адносін паміж памешчыкамі і сялянамі (п. 1 арт. 24); 2) зацвярджэнне ў правільнасці складання і засведчання дабрачынных умоў, названых у арт. 26; і 3) амаль усе распарадчыя справы па арт. 27. З гэтага часу абавязкі міравых пасрэднікаў абмяжоўваліся галоўным чынам разборам спраў, што ўзнікалі паміж сялянамі па справах грамадскага сялянскага кіравання і ў вырашэнні спраў судова-паліцэйскага разбіральніцтва, вы-

значаных арт. 31 таго ж Палажэння. Пры гэтым пасрэднік павінен быў удзельнічаць у рабоце паверачных камісій у сваім участку. Таму Віленскі генерал-губернатар «лічыў карысным скараціць колькасць участкаў у самых шырокіх памерах, з падзелам паветаў на магчыма меншую колькасць участкаў» [5].

У выніку, напрыклад, у пяці беларускіх паветах Віцебскай губ. з 17 міравых участкаў (у 1861 г.) у 1864 г. засталося 13 [6-7]. Мінская губ. была падзелена спачатку на 51 участак, а пасля новага размеркавання - на 26 [8], у чатырох беларускіх паветах Віленскай губерні з 21 участка засталося 8 [9-10]. Аналагічная карціна назіралася і ў 6 беларускіх паветах Гродзенскай губ.: у 1862 г. было 30, а ў 1864 г. стала 17 участкаў [11-12].

Аднак у Заходнім краі працэс змянення колькасці міравых участкаў быў неадназначным, у адрозненне ад астатніх губерняў. У 1865 г. было вырашана павялічыць «па неабходнасці» колькасць міравых участкаў у заходніх губернях (спачатку ў паўднёва-заходніх) «для больш паспяховага накіравання справы па пераўтварэнню ўстаўных грамат у выкупныя акты» [13, № 41978]. Важнай акалічнасцю сталі і рэкруцкія наборы 1865 і 1867 гг., калі міравым пасрэднікам нават дадалі да іх утрымання па 150 руб. на раз'езды ў іх участку па названай справе [14, № 43910]. Акрамя таго, у красавіку 1866 г. генерал-губернатару Паўночна-Заходняга края было дазволена ліквідаваць паверачныя камісіі, а нявырашаныя пытанні перадаваць у мясцовыя з'езды міравых пасрэднікаў дзеля правядзення новай праверкі ці выпраўлення выкупных актаў [14, № 43212].

У выніку абавязкаў у міравых пасрэднікаў стала больш, да таго ж можна дадаць і неабходнасць рэалізацыі рэформы дзяржаўных сялян, якія таксама сталі падлягаць ведамству агульнай адміністрацыі, у тым ліку і міравых пасрэднікаў. Таму колькасць міравых участкаў у беларускіх паветах у 1866-1867 гг. павялічылася: у Віленскай губ. - з 8 участкаў (1864 г.) да 16 (1867 г.) [10; 15], Віцебскай - з 13 (1864 г.) да 16 (1867 г.) [7; 16], Гродзенскай - з 17 (1864 г.) да 22 (1867 г.) [12; 17], Мінскай - з 26 (1864 г.) да 35 (1867 г.) [8; 18], Магілёўскай - з 34 (1864 г.) да 39 (1867 г.) [19-20].

Такая колькасць участкаў міравых пасрэднікаў праіснавала нядоўга. На беларускія паветы заходняга краю распаўсюджвалася агульнарасійская тэндэнцыя па скарачэнні колькасці ўчасткаў, асабліва пасля перадачы міраваму суду судовых функцый міравых пасрэднікаў у сувязі з распаўсюджваннем з 1872 г. на тэрыторыі Беларусі судовай рэформы 1864 г. Далейшае скарачэнне тлумачылася і ліквідацыяй у 1874 г. пасады міравых пасрэднікаў ва ўнутрырасійскіх губернях. Таму з 1872 г. ідзе паступовае скарачэнне колькасці ўчасткаў міравых пасрэднікаў. Да 1878 г. у Мінскай губ. засталося 18 участкаў міравых пасрэднікаў [21], а ў Магілёўскай - 19 [22]. У Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях інстытут міравых пасрэднікаў быў ліквідаваны ў 1878 г. Аналагічны працэс ішоў і ў іншых беларускіх паветах краю. У 1873 г. у Гродзенскай губ. засталося 18 участкаў, а ў 1882 г. - толькі 12 [23-24], у Віленскай губ. - адпаведна 12 і 8 [25-26]. У гэтых губернях пасада міравога пасрэдніка была ліквідавана законам 1903 г., а яго функцыі адразу з 1904 г. былі перададзены земскім начальнікам. Але колькасць участкаў міравых пасрэднікаў да гэтага часу ў цэлым засталася нязменнай.

Такім чынам, можна зазначыць, што ў заходніх губернях палітыка ўрада адносна міравых пасрэднікаў мела свае асаблівасці, што можна прасачыць па шматлікіх паказчыках і, у тым ліку па змяненнях у колькасным складзе міравых пасрэднікаў. У заходніх губернях гэтыя змены насілі хвалепадобны характар. Так, адразу пасля паўстання 1863-1864 гг. колькасць участкаў у цэлым скарацілася амаль у 2 разы, а з 1867 г. зноў узрасла, але не перавысіла размеркаванне 1861 г., а потым з 1871 г. зноў пайшоў працэс скарачэння як участкаў, так і колькасці міравых пасрэднікаў. Гэтыя змены былі абумоўлены павелічэннем ці памяншэннем ступені даверу з боку ўрада ў цэлым да пасады міравых пасрэднікаў, а таксама ростам ці скарачэннем іх паўнамоцтваў.

Літаратура і крыніцы


1. Полное собрание законов Российской империи (далей - ПСЗРИ). - 2-е собр. - Т. 36. - СПб., 1863. - № 36660.
2. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (далей - РДГА). - Фонд 1291. - Воп. 123. - Спр. 22.
3. Дело по предписанию Минского губернатора об объединении мелких волостей и сельских обществ // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей - НГАБ). - Фонд 242. - Воп. 1. - Спр. 198.
4. Сведения мировых посредников для годового отчета о ходе крестьянского дела в Минской губ. за 1865 г. // НГАБ. - Фонд 242. - Воп. 1. - Спр. 417.
5. Переписка с Минским губернским правлением с изложением содержания указов Сената, циркуляров и предписаний Минского губернатора по вопросам устройства и управления крестьянами в связи с реформой 1861г.






РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(30 декабря 1865 - 27 апреля 1866 гг.) // НГАБ. - Фонд 242. - Воп. 1. - Спр. 415.
6. Памятная книжка Витебской губернии на 1862 год - Витебск: Тип. губернского правления, 1862. - С. 72-73, 75-76, 78-79, 82-84.
7. Памятная книжка Витебской губернии на 1864 год / под ред. А.М. Сементовского. - СПб. : Тип. К. Вульфа, 1864. - С. 270-274.
8. Памятная книжка Минской губернии на 1864 год. - Минск: Губернская типография, 1864. - С. 146-148.
9. Памятная книжка Виленской губернии на 1862 год. - Вильно: Тип. А. Сыркина, 1862. - С. 118, 121-122, 126, 130.
10. Памятная книжка Виленской губернии на 1864 год. - Вильно: Тип. А. Сыркина, 1864. - С. 146, 151-152, 157, 163.
11. Памятная книжка Гродненской губернии на 1862 год. - Гродно: Тип. Гродненского губернского правления, 1862. - С. 19-31.
12. Памятная книжка Гродненской губернии на 1864 год. - Гродно: Тип. Гродненского губернского правления, 1864. - С. 19-22.
13. ПСЗРИ. - 2-е собр. - Т. 40 (1865). - № 41978.
14. ПСЗРИ. - 2-е собр. - Т. 41 (1866).
15. Памятная книжка Виленской губернии на 1867 год. - Вильно: Тип. А. Сыркина, 1867. - С. 190-191, 202, 208, 214.
16. Памятная книжка Витебской губернии на 1867 год / под ред. А.М. Сементовского. - СПб.: Тип. К. Вульфа, 1867. - С. 21-25.
17. Адрес-календарь служащих в Гродненской губернии лиц гражданского, военного и духовного ведомств на 1867 год. - Гродно: Тип. Гродненского губернского правления, 1867. - С. 26-31.
18. Памятная книжка Минской губернии на 1867 год. - Минск: Тип. Губернского правления, 1867. - С. 39, 45, 51, 57, 63, 69, 75-76, 84, 93.
19. Памятная книжка Могилевской губернии на 1864 год. - Могилев на Днепре: Тип. Губернского правления, 1864. - С. 75, 90, 101 115 128 139 152, 168, 181, 191,202.
20. Памятная книжка Могилевской губернии на 1867 год. - Могилев: Тип. Губернского правления, 1867.- С. 132-133, 150, 168, 181-182 200 213-214, 228-229, 242, 259, 276-277, 292.
21. Памятная книжка Минской губернии на 1878 год. - Минск: Тип. Губернского правления, 1878. - С. 153-154, 171-172, 187-188, 207, 233-234 253-254, 283-284, 303-304, 339.
22. Адрес-календарь Могилевской губернии на 1876 год. - Могилев на Днепре : Тип. Губернского правления, 1876. - С. 76, 99, 116, 124,141.
23. Памятная книжка Гродненской губернии на 1873 год. - Гродно: Тип. Гродненского губернского правления, 1873. - С. 39, 71-72,82,90-91,97-98,108.
24. Памятная книжка Гродненской губернии на 1882 год. Адрес-календарь и статистико-справочные сведения. - Гродно: Тип. Гродненского губернского правления, 1882. - С. 41, 72, 83, 89, 95, 103.



25. Памятная книжка Виленской губернии на 1873 год. - Вильно : Печатня А.Г. Сыркина, 1873.-С. 173, 181-182, 185-186, 190-191.
26. Памятная книжка Виленской губернии на 1882 год. - Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1882. - С. 244, 249-250, 254-255, 259-260, 265-266.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ